# З НОВЫМ ГОДАМ!

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

1980 г.
25
СНЕЖНЯ
ЧАЦВЕР
№ 36 (1300)
Выходзіць раз у тыдзень.
Цана 2 кап.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА
БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

## ПЛЁННЫХ ЗДАБЫТКАЎ!

ДАРАГІЯ ТАВАРЫШЫ! Праз некалькі дзён здабыткам гісторыі стане год 1980-ы. Сёння мы можам з упэўненасцю сказаць, што ён з'явіўся годам новых велічных дасягненняў у розных сферах нашага шматграннага жыцця. Савецкі народ пад мудрым кіраўніцтвам Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада зрабіў значны крок у сваім эканамічным і сацыяльна-палітычным развіцці. На карце нашай Радзімы паявіліся маладыя гарады і новабудоўлі, заводы і фабрыкі, адкрылі дзверы новыя сярэднія і вышэйшыя навучальныя ўстановы.

Вялікі рэзананс у савецкіх людзей выклікаў праект ЦК КПСС да XXVI з'езда партыі «Асноўныя напрамкі эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР на 1981—1985 гады і на перыяд да 1990 года». Гэты дакумент вялікай гістарычнай важнасці — яшчэ адно сведчанне клопатаў Камуністычнай партыі аб дабрабыце савецкіх людзей. Усім сваім зместам ён сведчыць аб неабвержных перавагах савецкага ладу жыцця, узрослых магчымасцях развітога сацыялізму. У адзінаццатай пяцігодцы яшчэ больш поўна раскрыюцца яго творчыя сілы, яшчэ больш арганічна злучацца інтарэсы і мэты грамадства, працоўных калектываў, рабочых, інтэлігенцыі і калгаснага сялянства. Выкладчыкі, студэнты, супрацоўнікі універсітэта з вялікай цікавасцю і ўвагай аднесліся да вывучэння і абмеркавання праекта.

Надыходзячы год — год XXVI з'езда КПСС. Гэта таксама год юбілею нашага універсітэта. Таму патрэбна, каб намаганні ўсяго шматтысячнага калектыву зліліся ў адзін магутны паток. Неабходна настойліва паглыбляць свае веды, вучыцца і працаваць так, як завяшчаў вялікі Ленін.

Студэнцкія гады — цудоўныя, і разам з тым адказная пара. У аўдыторыях, на кафедрах, у лабараторыях гартуюцца будучыя спецыялісты, якім працягваць далей слаўныя традыцыі універсітэта. Усё гэта патрабуе ад выкладчыкаў максімальнай аддачы, творчай і ўдумлівай арганізацыі вучэбнага працэсу.

Разам з намі вучацца пасланцы многіх краін свету. Іх прывяла да нас адна мэта — адкрываць цудоўны свет навукі. Пажадаем жа ім поспехаў у гэтай адказнай, складанай справе. І будзем спадзявацца, што веды, набытыя ў БДУ імя У. І. Леніна, будуць накіраваны на ўмацаванне міру, дружбы і супрацоўніцтва паміж людзьмі нашай планеты.

Няхай жа 1981 год стане для ўсіх нас, тых, хто вучыцца, і тых, хто вучыць, годам новых імкненняў і пошукаў, знаходак і здзяйсненняў, няхай ён будзе адзначаны радасцямі адкрыццяў і творчых перамог.

Сардэчна віншуем прафесарска-выкладчыцкі калектыў, усіх студэнтаў і супрацоўнікаў універсітэта з надыходзячым святам.

Шчасця вам, таварышы!

**ПАРТКОМ**
**РЭКТАРАТ**
**МЯСЦКОМ**
**КАМІТЭТ КАМСАМОЛА**
**ПРАФКОМ**




● СЛОВА ДА ЧЫТАЧА

## 1300 ЭКЗАМЕНАЎ НА ПРЫЗНАННЕ




Чытач! Ты разгарнуў чарговы выпуск газеты «Беларускі універсітэт». Чарговы. Але паглядзі на яго парадкавы нумар. Так-так. Тысяча трохсоты! Юбілейны!

1300 нумароў — 1300 сур'ёзных экзаменаў на прызнанне. Чытачы — строгія экзаменатары. Яны не даруюць «слабай падрыхтоўкі». Вось чаму кожны нумар — гэта страснае імкненне рэдакцыі знайсці «свайго» чытача: данесці да яго тое, чым ён цікавіцца, што яго турбуе, паведаміць і заклікаць, узрушыць і падрыхтаваць, арганізаваць і накіраваць...

1300 хвалюючых, незабыўных сустрэч. Ім папярэднічала нястомная, падзвіжніцкая праца рэдакцыйнага карэспандэнта і нештатнага аўтара, машыністкі і адказнага сакратара, члена рэдкалегіі і мастака. Часцінка іх сэрца укладзена ў кожны радок. У газеце радкоў — каля дзвюх тысяч.

Крок за крокам рабіла газета. Ты трымаеш свежы нумар. Ён яшчэ густа пахне фарбай і не паспеў астыць ад цеплыні друкарскіх машын, ад цеплыні руплівых рук лінатыпіста, вяр-

(Працяг на 2-й стар.).

● ПЕРАДСВЯТОЧНАЕ ІНТЭРВ'Ю

## Ад шчырага сэрца

**ЛЕАНІД ГАЙДУКЕВІЧ, намеснік сакратара камітэта камсамола БДУ па інтэррабоце:**

— Жадаю студэнтам поспехаў у вучобе, актыўнасці ў грамадскім жыцці.

У адносінах да замежных студэнтаў — хацелася б часцей бачыць іх у поўным саставе на занятках, больш ініцыятыўнымі на факультэтах. Адчувайце сябе, як дома!

**Т. Ф. ЦІХАМІРАВА, урач паліклінікі БДУ:**

— Кажуць, што адна гадзіна смеху прадаўжае жыццё. Дык усмешак вам, вясёлага настрою!

**ЛІ АМАДУ, студэнт III курса факультэта журналістыкі (Гвінея-Бісау):**

— Пажадаю ўсім здароўя — гэта я лічу галоўным — і радасці ў жыцці. Моцнай сілы волі, каб пераадольваць усе цяжкасці. Заўжды быць добрымі і прыгожымі.

**В. Ф. ЦІКАВЫ, дэкан хімічнага факультэта:**

— Галоўнае маё пажаданне — ніколі не губляйце надзеі, нават у самых цяжкіх становішчах. Самае лепшае ў жыцці — наперадзе. Але толькі не чакайце, што гарызонт вашых жаданняў сам наблізіцца. Ідзіце яму насустрач!

**АЛЯКСАНДР АГІБАЛАЎ, аспірант кафедры тэорыі фізікі:**

— Хачу, каб усе людзі на зямлі сталі сумленнымі ў поўным сэнсе гэтага слова.

**У. М. РЭЙЗІН, выкладчык кафедры фізічнага выхавання і спорту:**

— Адно з маіх вялікіх пажаданняў — убачыць студэнта БДУ членам Алімпійскай зборнай СССР. Хочацца верыць, што смелыя імкненні нашай моладзі прывядуць да вялікіх спартыўных дасягненняў. Спадзяюся, што імёны будучых чэмпіёнаў, майстроў спорту БДУ прагучаць не толькі на старонках савецкага, але і сусветнага друку.

**АЛІНА ГРЫШКЕВІЧ, студэнтка факультэта журналістыкі:**

— Хачу, каб у імгненне, калі стары 1980 год уступіць месца новаму 1981 году, увесь зямны шар усміхнуўся і азарыўся промнямі шчасця і міру.



# 1300 экзаменаў на прызнанне

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

стальшчыка, карэктара, друкара. Іх пільнае вока, майстэрства і вопыт дапамаглі зрабіць гэты крок.

1300 нумароў — 1300 старонак летапісу слаўнага Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Перагортваць шматтыражку — не толькі прабегчы вачыма, дзе напісана чорным па белым. Гэта шчасце быць сведкам неадольнага росту ўсяго універсітэта, яго шматтысячнага калектыву — студэнтаў, вучоных, супрацоўнікаў.

1300 працягаў традыцый друкаванага органа універсітэта. «Голас рабфакаўца», «Белорусский студент», «Шлях студэнцтва», «Ленінскім шляхам», «За бальшавіцкія кадры», «За пралетарскія кадры», «За ленінскія кадры», «Кузня пралетарскіх кадраў». Па-рознаму называлася шматтыражка БДУ. Не ў назве справа. Яна змагалася і змагаецца за далейшае развіццё навуковых даследаванняў і іх усё большую сувязь з вытворчасцю, павышэнне ўзроўню падрыхтоўкі спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі, паляпшэнне палітыка-выхаваўчай работы ў калектыве.

Традыцыі «Беларускага універсітэта» кавалі А. Акулаў, М. Аўрамчык, Р. Булацкі, А. Волк, В. Дубовік, А. Зінін, І. Навуменка, В. Мацвееў, В. Міхайлаў, А. Лойка, І. Сачанка, М. Цікоцкі, В. Чанін, В. Шыцік... Яны гартавалі універсітэцкую шматтыражку, у сённяшнім яе вобліку ёсць і іх штрыхі.

Чытач! Юбілей газеты — твой юбілей, тваё свята! Віншуем. І не развітваемся. У момант, калі ты чытаеш гэтыя радкі, кіпіць праца над наступным нумарам. 1301-м...

**ПАВАЖАНЫЯ ТАВАРЫШЫ! СУПРАЦОЎНІКІ ГАЗЕТЫ «БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ», ЧЛЕНЫ РЭДКАЛЕГІІ, АЎТАРСКІ АКТЫЎ! САРДЭЧНА ВІНШУЕМ ВАС З ВЫПУСКАМ ЮБІЛЕЙНАГА НУМАРА.**

**СЛАЎНЫ ШЛЯХ ПРАЙШЛА ГАЗЕТА. З'ЯЎЛЯЮЧЫСЯ ОРГАНАМ ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА, ЯНА ЎНЕСЛА ЗНАЧНЫ ЎКЛАД У СПРАВУ КАМУНІСТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ СТУДЭНЦКАЙ МОЛАДЗІ, СТАЛА АКТЫЎНЫМ ПРАПАГАНДЫСТАМ ДАСЯГНЕННЯЎ УНІВЕРСІТЭТА, ТРЫБУНАЙ ПЕРАДАВОГА ВОПЫТУ І ГРАМАДСКАЙ ДУМКІ. ГАЗЕТА АПЕРАТЫЎНА АДГУКАЕЦЦА НА ЎСЕ ПАДЗЕІ ШМАТГРАННАГА ЖЫЦЦЯ УНІВЕРСІТЭТА, ВОСТРА КРЫТЫКУЕ НЕДАХОПЫ, ДАБІВАЕЦЦА ІХ ВЫКАРАНЕННЯ.**

**НЯХАЙ І НАДАЛЕЙ ГАЗЕТА «БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ» БУДЗЕ НЯСТОМНЫМ ПРАПАГАНДЫСТАМ, АРГАНІЗАТАРАМ ЦІКАВЫХ СПРАЎ, СТРАСНЫМ ЛЕТАПІСЦАМ ФЛАГМАНА ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ РЭСПУБЛІКІ.**

**ПАРТКОМ**
**РЭКТАРАТ**
**МЯСЦКОМ**
**КАМІТЭТ КАМСАМОЛА**
**ПРАФКОМ**

# НАС ВІНШУЮЦЬ

## «Советская Белоруссия»

Редколлегия, партийное бюро и местный комитет редакции газеты «Советская Белоруссия» горячо поздравляют коллектив многотиражной газеты «Беларускі універсітэт» с выходом в свет 1300 номера газеты. Желаем коллективу редакции дальнейших творческих успехов, журналистских поисков и интересных находок.

## «Звязда»

Дарагія калегі! Шчыра віншуем вас з нагоды выхаду ў свет 1300 нумара старэйшай шматтыражнай газеты беларускіх ВНУ — «Беларускага універсітэта».

Ад усяго сэрца жадаем вам вялікага журналісцкага плёну, новых пошукаў і здабыткаў у распрацоўцы маладзёжнай тэматыкі і заўжды бадзёрага, рабочага настрою.

## «Знамя юности»

Шлем сердечные поздравления и самые наилучшие пожелания в день выхода 1300 номера вашей газеты. С маленьких заметок в «Беларускім універсітэце» начинали свой журналистский путь многие из тех, чьи «подвалы» можно нынче увидеть на страницах «Знаменки». Да и не только бывшие журфаковцы, но и выпускники других факультетов могут сказать немало теплых слов в адрес многотиражки, которая была и остается хорошим, верным товарищем каждого студента БГУ.

Пусть и в дальнейшем «Беларускі універсітэт» вносит столь же достойный вклад в подготовку кадров, становление молодых специалистов в одном из крупнейших вузов республики, пусть всегда будут остры ваши перья.

## «Чырвоная змена»

Калектыў «Чырвонай змены» віншуе шматтыражную газету «Беларускі універсітэт» з выхадам 1300 нумара.

Жадаем вам, дарагія сябры, далейшага творчага пошуку, камсамольскага запалу, баявітасці ў вашай рабоце. Нам прыемна бачыць, што ў сваёй газеце вы ўзнімаеце і паспяхова вырашаеце праблемы, якія хвалююць студэнтаў, ярка асвятляеце вучобу і адпачынак, святы і будні моладзі універсітэта. Вы добра адчуваеце, што цікавіць і хвалюе студэнцтва, і гэта робіць папулярнай вашу газету.

Для многіх будучых работнікаў прэсы рэдакцыя вашай газеты з'яўляецца прафесіянальнай школай. З большасцю сённяшніх журналістаў рэспубліканскага друку, радыё і тэлебачання мы пазнаёміліся менавіта праз вашу газету.

Яшчэ раз жадаем вам поспехаў, цікавых і таленавітых аўтараў.

## «На страже Октября»

Коллектив редакции газеты Министерства внутренних дел БССР «На страже Октября» сердечно поздравляет вас с выходом в свет 1300 номера газеты.

Ваша газета является настоящей летописью жизни главного высшего учебного заведения республики — Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета имени В. И. Ленина.

Журналисты газеты «На страже Октября» всегда с теплотой вспоминают те годы, когда, будучи студентами факультета журналистики, сотрудничали с «Беларускім універсітэтам».

Желаем вам новых успехов в журналистском труде, большого личного счастья.

## «Интеграл»

Сардэчна віншуем вас з выхадам юбілейнага, 1300 нумара газеты. На працягу многіх год «Беларускі універсітэт» — любімая газета выкладчыкаў і студэнтаў буйнейшай навучальнай установы рэспублікі.

Жадаем вам, дарагія сябры, захаваць вернасць традыцыям штотыднёвіка, невычэрпнага творчага духу!

Мы віншуем з гэтай нагоды!
Колькі зведаў ты зім і лет!
Маладзей жа год ад году,
«Беларускі універсітэт».

## «Экономист»

Одна тысяча триста номеров старейшей вузовской газеты республики — это одна тысяча триста серьезных экзаменов, сданных самому притязательному экзаменатору — читателю. Это сотни журналистских находок, сотни материалов, составивших в целом летопись прославленного БГУ.

Редакция газеты «Экономист» БГИНХ им. В. В. Куйбышева, газетный багаж которой ровно в десять раз меньше, сердечно поздравляет с юбилеем старшего собрата — «Беларускі універсітэт» и желает плодотворной работы на благородной ниве коммунистического воспитания студенческой молодежи.

## «Советский медик»

От всего сердца поздравляем журналистов редакции газеты «Беларускі універсітэт», многочисленный авторский актив с выходом в свет 1300 номера.

Присущие вашей газете самобытный почерк, публицистическая направленность и злободневность тематики позволили ей стать подлинной трибуной студенчества. Неоценимую помощь оказывает многотиражка в почетном деле подготовки и воспитания будущих специалистов народного хозяйства. Пусть же и впредь газета остается такой же боевой, задорной, наполненной яркими, незаурядными материалами.

## «Технолог»

Ад свайго малодшага сабрата, газеты «Технолог» Беларускага тэхналагічнага інстытута, прыміце самыя шчырыя віншаванні са знамянальнай падзеяй — 1300 нумарам вашай газеты, якая за гады існавання стала сапраўдным калектыўным арганізатарам. У гэтым вялікая заслуга вашага творчага калектыву, якому мы ад усяго сэрца жадаем новых журналісцкіх задумак, плёну ў працы, пошукаў, творчых знаходак.

## «Знамя труда»

Поздравляем вас с выходом юбилейного, 1300 номера газеты. Желаем вам постоянного творческого поиска, горения, мастерства, удач. А конкретнее:

Чтоб не тупились ваши перья,
Дышала страстностью строка,
Чтоб слово каждое — по цели,
Как было, есть, во всем,
всегда!

## «Савецкі настаўнік»

1300 нумароў «Беларускага універсітэта». І ў кожным адчуваецца імкненне рабіць газету творча, з агеньчыкам.

Калектыў рэдакцыі газеты «Савецкі настаўнік» выказвае ўпэўненасць, што вы, паважаныя калегі, і надалей будзеце спрыяць падрыхтоўцы высокакваліфікаваных кадраў.



**● ТОЛЬКІ ФАКТ**

### КАНФЕРЭНЦЫЯ ЧЫТАЧОЎ

**газеты «Беларускі універсітэт» адбылася на факультэце журналістыкі. Перад студэнтамі першага курса выступілі супрацоўнікі рэдакцыі. Яны расказалі аб рабоце ў газеце, падзяліліся планамі на будучае.**

**Г. БЯЛЬКЕВІЧ.**

### АЛІМПІЙСКІЯ ЧЭМПІЁНЫ

**былі гасцямі студэнтаў БДУ. На творчую сустрэчу прыйшлі неаднаразовыя чэмпіёны свету і Алімпійскіх гульняў А. Бялова, В. Сідзяк, А. Газаў, удзельнік Маскоўскай Алімпіяды А. Касянкоў.**

**В. ЕФІМЕНКА.**

**ЛЕКЦЫЯМ — ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ І ЯКАСЦЬ**

# Сядзем за першыя парты?

**ПРАЦЯГВАЕМ АБМЕРКАВАННЕ ПРАБЛЕМЫ, УЗНЯТАЙ У МАТЭРЫЯЛЕ «ЦІ ВЕЧНЫ «ШЧАСЛІВЫ БІЛЕТ!»**

— Як табе не сорамна? Не рві больш канспект на запіскі!

— Як табе не сорамна? Адарвіся ад гэтай кнігі, слухай выкладчыка!

— Як табе не сорамна? Адвядзі вочы ад акна, вярніся ў аўдыторыю!

Ці не праўда, рэдка хто стане ўсур'ёз рабіць свайму таварышу падобныя заўвагі. У матэрыяле «Ці вечны «шчаслівы білет?» І. Цалуйка і Л. Трапезнікава ўсё ж адважыліся зрабіць такія папрокі.

Зразумела высакародная мэта аўтараў рэпартажа: змяніць нешта ў нашых адносінах да лекцый. Яны даюць імгненны здымак. Давайце паглядзім на сябе, задумаемся. І з сорамам адзначым, што так праходзяць некаторыя лекцыі і ў нас. Так праходзіць кароткі час, адведзены нам на актыўнае ўзбагачэнне ведамі.

Вядома, аўтары не спадзяваліся на нейкую дырэктыву дэканата ці камітэта камсамола, якая б змяніла «атмасферу» студэнцкай аўдыторыі, настроіла яе на патрэбны лад. Што можа прымусіць студэнта вучыцца, акрамя яго ўласнага жадання?

Памятаеце, яно было самым моцным, калі хадзілі мы яшчэ ў «зялёных» абітурыентах. А потым? Растрэслася недзе праз семестры. Але назусім не пакінула нас: абуджаецца з кожнай глыбокай, удумлівай лекцыяй, з кожнай старонкай разумнай, шчырай кнігі. І тады сапраўды адчуваеш неабходнасць вырвацца з галёркі, сесці ўперад: тут лягчэй успрымаць лекцыю. Згадзіцеся, нязручна пісаць канспект, седзячы паміж суседзяў, якія гуляюць у «марскі бой», заўзята гартаюць кніжкі, перадаюць запіскі...

І яшчэ адна цікавая з'ява адбываецца ў апошні час на галёрцы. Сюды паціху перасяліліся заядлыя «грамадскія работнікі». І ўжо не пісьмы маці, а справаздачы, пратаколы, ведамасці і іншыя канцылярскія атрыбуты засцілаюць апошнія парты.

Я не хачу сказаць: давайце сядзем за першыя парты. Галёрку не перахітрыш — яна застанецца галёркай і тут, у першых радах.

Але ці здолееш ты, мой таварыш студэнт, зрушыць галёрку ва ўласнай свядомасці? Ад сесіі да сесіі пажыць не толькі весела, але і плённа? І, збегаўшы на перапынку за булачкай, не забыцца пра сваю духоўную ненасычанасць...

**А. ЦІХАНОВІЧ,**
**студэнтка журфака.**



НА ЗДЫМКУ: Генадзь Вішнеўскі і Анатоль Рудовіч — майстры рэдкай прафесіі. Яны працуюць у шкловыдзімальнай майстэрні хімічнага факультэта.

Фота М. ДУБОВІКА.

ГАЗЕТА ВЫСТУПІЛА

## «ЛЫЖКА ДЗЁГЦЮ»

«Факт, указаны ў газеце «Беларускі універсітэт» ад 13 лістапада 1980 года ў матэрыяле «Лыжка дзёгцю», меў месца на гістарычным факультэце. Сапраўды, студэнтка 5-га курса аддзялення гісторыі Л. Гужава не плаціла за пражыванне ў інтэрнаце № 1. У цяперашні час студэнтка за ўсе гады пражывання ў інтэрнаце заплаціла.

Членамі прафбюро факультэта выпісаны ўсе прозвішчы студэнтаў, якія не заплацілі за інтэрнат. Пытанне абмеркавана на пасяджэнні прафбюро».

**М. ДАЎГЯЛА,**
**старшыня прафбюро гістфака.**

КАМАНДЗІРОЎКА Ў ІНТЭРНАТ

# У палоне інерцыі

ІНТЭРНАТ № 2. Сучасны, шматпавярховы будынак. Блочная сістэма пакояў з усімі выгодамі. Студэнты двух факультэтаў пражываюць тут. Журналісты і фізікі.

Студсавет выбраны на агульным сходзе. Складзены графік дзяжурства на паверхах, у фае, створаны аператыўны атрад, прыступілі да афармлення наглядпай агітацыі. Вось што зроблена, што робіцца. Аднак не на такім узроўні, як хацелася бачыць.

Возьмем дзяжурства на паверхах. Так, графік складзены. Але выконваецца як? Куды «прападаюць» дзяжурныя? Старшыня студсавета В. Саўчук і адказны за дзяжурства ў інтэрнаце С. Роберман запэўнівалі, што ўсё—«шык і бляск». Адразу пасля нашай размовы з В. Саўчуком я прайшоў па інтэрнату. Вынік даволі сумны: з васьмі паверхаў, на якіх жывуць студэнты, на чатырох дзяжурныя адсутнічалі. У той жа вечар, а палове восьмай, нікога з членаў аператыўнага атрада не было ў фае інтэрната. Заўважым, гэта ў нядзелю. Наплыў наведвальнікаў інтэрната ў гэты час найбольшы.

Праз некалькі дзён разам з С. Роберманам мы зноў праверылі дзяжурства. Малюнак — стары. Як тады растлумачыць запэўніванне В. Саўчука і С. Робермана? Не хапае патрабавальнасці? Згодзен. Але калі даручана справа, патрэбна выконваць яе не проста «абы з рук збыць».

Востра стаіць пытанне з афармленнем ленінскіх пакояў. У журналістаў гэта работа завяршаецца дзякуючы намаганням студэнта III курса У. Дзюбы. У фізікаў так і не давялося нічога ўбачыць, акрамя прыгожай аб'явы на 12 паверсе: «Ленінскі пакой працуе з 19.00 да 23.00. Адказны І. Дабрыян». Дзверы пакоя ўпрыгожваў вялізны складскі замок. Алег Калакуцкі, старшыня культурна-выхаваўчай камісіі, спачатку ніяк не мог успомніць, на якім паверсе знаходзіцца ленінскі пакой. Прыйшлося падказаць. Блытана і незразумела расказваў ён аб сваёй рабоце. Увогуле ён заявіў, што ніякага дачынення да ленінскіх пакояў не мае. Ёсць куратары з ліку выкладчыкаў, старасты паверхаў, нарэшце—адказныя за работу ленінскіх пакояў. Чым займаецца камісія? Правялі вечар да кастрычніцкіх свят... Больш нічога А. Калакуцкі не змог успомніць. А шкада. Студэнтам самім прыходзіцца праяўляць ініцыятыву. Вось і ўзнікаюць стыхійныя «танцы». Незразумела, для чаго існуе культурна-выхаваўчая камісія. Магчыма, для папер, справаздач...

Высветлілася, што не ўсе пакоі забяспечаны неабходным інвентаром. Не хапае сталоў, табурэтак і г. д. Што робіцца студсаветам? Праведзены вопіс. Яшчэ ў пачатку лістапада. А на вуліцы ўладарнічае снежань. Ёсць падстава задаць пытанне: ці не на наступны год адкладзена забеспячэнне?

Нездавальняючае становішча склалася з бытавымі пакоямі. Другі месяц не можа вырашыцца пытанне з іх абсталяваннем. Спачатку не былі ўсталёўлены замкі, потым ніяк не маглі забіць цвікі для люстры. Цяпер затрымка за сталамі і прасамі. «Немагчыма атрымаць у каменданта», — адказалі мне ў студсавеце. А камендант павяла мяне ў адзін са службовых пакояў: — «Вось тут 136 сталоў. Іх патрэбна разнесці па паверхах». Студсавет ніяк не можа арганізаваць 2—3 чалавек. Можна зрабіць і такім чынам, каб кожны студэнт адпрацаваў некалькі гадзін на добраўпарадкаванні інтэрната. Гэта ж для саміх сябе. Чаму жыллёва-бытавая камісія чакае, што гэта зробіць нехта іншы?

Наогул студсавет мала дапамагае адміністрацыі інтэрната па гаспадарчай частцы. Хоць у палажэнні аб студэнцкім інтэрнаце, зацверджаным ЦК прафсаюза работнікаў асветы, вышэйшай школы і навуковых устаноў, ясна запісана: «Савет студэнцкага інтэрната ствараецца ў мэтах аказання дапамогі адміністрацыі, прафкому і камітэту ВЛКСМ навучальнай установы ў арганізацыі выхаваўчай, культурна-масавай, фізкультурна-спартыўнай работы і паляпшэння жыллёва-бытавога абслугоўвання студэнтаў, якія пражываюць у інтэрнаце».

Распрацаваны план ідэйна-выхаваўчых мерапрыемстваў. Вось некаторыя пункты: сустрэчы з замежнымі студэнтамі (іх амаль палова ў інтэрнаце); стварыць спортактыў інтэрната; своечасова рыхтавацца да свят (?!). Здзіўленне, не больш, выклікае такі план работы.

Надыходзіць сесія, сярэдзіна навучальнага года. А ў студсавеце, мне здаецца, яшчэ толькі пачатак. З такімі тэмпамі далёка не пойдзеш.

**М. ЛАХВІЧ.**

*«АКТЫЎНА РАЗВІВАЦЬ МАСАВУЮ ФІЗКУЛЬТУРУ І СПОРТ, САДЗЕЙНІЧАЦЬ БОЛЬШ ШЫРОКАМУ ЎКАРАНЕННЮ ІХ У ШТОДЗЁННЫ БЫТ САВЕЦКІХ ЛЮДЗЕЙ. УЗМАЦНІЦЬ ФІЗКУЛЬТУРНУЮ І СПАРТЫЎНУЮ РАБОТУ СЯРОД ДЗЯЦЕЙ І МОЛАДЗІ».*

*(З праекта ЦК КПСС «Асноўныя напрамкі эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР на 1981—1985 гады і на перыяд да 1990 года»).*

# БЫЦЬ ФЛАГМАНАМ І Ў СПОРЦЕ

**З XIII СПРАВАЗДАЧНА-ВЫБАРНАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ СПОРТКЛУБА БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА**

### СУМНАЯ АРЫФМЕТЫКА

Чарговая справаздачна-выбарная канферэнцыя спортклуба універсітэта адбылася праз два гады пасля папярэдняй. У спартыўным летапісе гэты перыяд — асаблівы. Год назад прайшла VII летняя Спартакіяда народаў СССР, а сёлета — XXII Алімпійскія гульні ў Маскве. На спартакіядзе толькі 5 спартсменаў універсітэта абаранялі гонар рэспублікі, а на Алімпіядзе наогул прадстаўнікоў БДУ не было. Заўважу, што толькі ад Гомельскага універсітэта на спартакіядзе выступала 17 удзельнікаў, а ад Гродзенскага — 13. Былі прадстаўнікі гэтых універсітэтаў і на Алімпіядзе-80. Студэнты з Гомеля і Гродна М. Кіраў і М. Пачанчук сталі прызёрамі Гульняў.

Спортклуб БДУ не выканаў пяцігадовы план падрыхтоўкі майстроў спорту СССР. Наогул сярод ВНУ рэспублікі па гэтаму паказчыку наш універсітэт займае 18 месца, а па падрыхтоўцы спартсменаў першага разраду і кандыдатаў у майстры спорту яшчэ горш — 22 месца. За апошнія 4 гады ва універсітэце не падрыхтаваны ніводзін майстар спорту міжнароднага класа.

Рэзка знізілася колькасць членаў зборных каманд СССР і БССР. Па выніках рэспубліканскай студэнцкай спартакіяды «Буравесніка» універсітэт ідзе на 6-м месцы, уступаючы калектывам радыётэхнічнага інстытута і інстытута народнай гаспадаркі. Як ні горка ўсведамляць, але такі факт. Па выніках агляду-конкурсу на лепшую пастаноўку фізкультурна-масавай работы сярод ВНУ з колькасцю студэнтаў звыш 7 тысяч чалавек Беларускі дзяржаўны універсітэт займае ў краіне 53 месца...

Далей, як гаворыцца, ісці нельга. У чым жа справа?

### НЕ ТОЛЬКІ БАЗА

Помніцца, два гады назад на канферэнцыі спортклуба называліся прычыны адставання. Галоўная з іх — слабая матэрыяльная база (з 1966 года будаўніцтва залаў не вялося, а кантынгент студэнтаў вырас больш чым у два разы). Рэктаратам прымаюцца меры па ліквідацыі такога становішча: вядуцца работы па праектаванню спартыўнага комплексу па вуліцы Кастрычніцкай.

На іншыя прычыны адставання адказаў у некаторай ступені дакладчык — старшыня спортклуба В. П. Шапялевіч. У першую чаргу крок назад тлумачыцца тым, што з боку былога загадчыка кафедры фізвыхавання В. Фефелава недастаткова аддавалася ўвагі камплектацыі кафедры выкладчыцкім саставам, які б здолеў рыхтаваць спартсменаў высокага класа. Многія трэнеры абыякава адносіліся да сваёй работы. Гэта А. Заўялаў, А. Расолька, А. Аніскевіч, М. Церахава і іншыя. Яшчэ два гады назад на канферэнцыі спортклуба крытыкаваліся кафедра і спартыўны клуб за тое, што яны працуюць па старых метадах. Не выпадкова дзейнасць спорткафедры і спартыўнага клуба падвяргалася ў лютым 1980 года справядлівай крытыцы на расшыраным пасяджэнні рэктарата.

За апошнія гады знізілася колькасць студэнтаў, якія займаюцца ў секцыях, наогул перасталі існаваць групы спартыўнага ўдасканалення па ручному мячу, грэблі на байдарках і каноэ, шахматах, шашках. Не праводзяцца заняткі з дубліруючымі саставамі зборных каманд па іграўых відах спорту. Дрэнна працуе секцыя кулявой стральбы.

Нямала недахопаў у правядзенні агульнауніверсітэцкай спартакіяды, у арганізацыі спартыўна-масавай работы на факультэтах. Часта спаборніцтвы праходзяць стыхійна, з малой колькасцю ўдзельнікаў і гледачоў, што, зразумела, не садзейнічае папулярызацыі спорту.

Дакладчык прыводзіў факты, калі, напрыклад, дрэнна прайшло спаборніцтва на першынство БДУ па мнагабор'ю ГПА (адказны—выкладчык У. Яжоў). З-за нездавальняючай арганізацыі і няявак на спаборніцтвы былі выключаны з ліку ўдзельнікаў зборныя каманды біяфака і геафака па шахматах і шашках. (Адказныя — старшыя выкладчыкі В. Мурашоў і А. Ішчанка). На мехмаце, юрфаку, журфаку многія студэнты, якія былі заяўлены, наогул не з'яўляліся на спаборніцтвы.

Была дадзена прынцыповая ацэнка арганізацыі спартыўна-масавай работы сярод супрацоўнікаў універсітэта. Адзначана, што БДУ па падрыхтоўцы значкістаў ГПА сярод супрацоўнікаў займае 18 месца ў рэспубліцы. Вельмі слабай застаецца таксама матэрыяльная база турысцкага клуба, хоць размова аб ёй ідзе ўжо не першы год. Яшчэ мала зроблена спартыўным клубам і прафкомам універсітэта па арганізацыі фізкультурна-аздараўленчай работы сярод студэнтаў, якія пражываюць у інтэрнатах. Адзначана слабае выступленне універсітэцкіх зборных каманд па валейболу і баскетболу (мужчыны), стральбе, вольнай барацьбе і інш.

Самакрытычны, дзелавы тон, які быў зададзены дакладчыкам, падтрымалі выступіўшыя ў спрэчках. Ішла жывая, зацікаўленая размова аб нявырашаных праблемах, якія стрымліваюць развіццё фізкультуры і спорту ва універсітэце.

У выступленнях старшынь спартыўных бюро Р. Залескага (фізфак), М. Жука (філфак), А. Камовіча (гістфак), У. Лукашэвіча (юрфак), Л. Манжуры (ФПМ), члена спортклуба В. Ціханюка, в.а. загадчыка кафедры фізвыхавання С. У. Макарэвіча і іншых узнімаліся вострыя праблемы, якія неабходна рашыць спортклубу і кафедры фізвыхавання.

### НА ЎЗРОВЕНЬ СУЧАСНЫХ ПАТРАБАВАННЯЎ

Рэктар універсітэта акадэмік АН БССР У. А. Белы ў сваім выступленні на канферэнцыі адзначыў, што сёння цяжка пераацаніць ролю і значэнне спорту ў фарміраванні ўсебакова развітога спецыяліста. Таму партком, рэктарат ставяць задачу перад дэканатамі, партыйнымі і грамадскімі арганізацыямі ўдзяляць кожнаму студэнту-спартсмену максімальную ўвагу, ствараць ім неабходныя ўмовы для вучобы і трэніровак. Наша агульная справа — дастойна сустрэць 60-годдзе з дня стварэння універсітэта, адзначыць яго поспехамі ў спартыўнай рабоце.

На канферэнцыі былі падведзены вынікі чарговай XXVIII агульнаўніверсітэцкай спартакіяды. Пераможцы — калектывы фізічнага, гістарычнага і хімічнага факультэтаў атрымалі прызы. **Пераходны прыз рэдакцыі газеты «Беларускі універсітэт» уручаны факультэту журналістыкі — пераможцу агульнауніверсітэцкага кросу сярод першых курсаў.**

Хочацца верыць, што прынцыповы, дзелавы падыход на канферэнцыі да праблем развіцця спорту будзе прадоўжаны ў рабоце новага саставу праўлення спартыўнага клуба. Яго намаганні, а таксама дапамога ўсіх грамадскіх арганізацый, ад якіх залежыць далейшае развіццё фізкультуры і спорту ў Беларускім дзяржаўным універсітэце імя У. І. Леніна, змогуць ліквідаваць адзначаныя недахопы, зноў вернуць універсітэт на передавыя пазіцыі ў спорце.

**У. ШЫК.**

# Анкета студэнта-выпускніка

1. Прозвішча.

2. Навошта паступілі ў ВНУ (марылі з дзяцінства; цяга да ведаў; бесклапотнае студэнцкае жыццё; прэстыж; больш не было куды ісці).

**Патрэбнае падкрэсліць.**

**Заўвага. У другім пункце ўкажыце канкрэтна, з якога часу (з дня нараджэння; з дзіцячага сада; пасля выпускных экзаменаў; пасля некалькіх курсаў іншага інстытута).**

3. Калі вас пазбаўляюць стыпендыі ці інтэрната, куды вы часцей за ўсё звяртаецеся (у дэканат, у прафком, у газету).

4. Адносіны да вучобы (наведваеце; часта наведваеце; вельмі часта наведваеце; ходзіце кожны дзень).

5. У якім стане залікоўка (няма; ёсць, але не ведаеце дзе; ведаеце дзе, але не ведаеце, што залікоўка).

6 Забыць тое, што вывучалі ў ВНУ, плануеце не раней, чым праз: тыдзень; месяц; год (калі пазней, то ўказаць).

7. Пасаля заканчэння ВНУ мяркуеце сесці на шыю: сабе; сваім бацькам; бацькам жонкі ці мужа; іншым родным.

8. Жадаеце размеркавацца: у аддаленыя сельскія раёны; у блізкія сельскія раёны; у максімальна набліжаныя сельскія раёны...

---

**У святочным выпуску ЛІФТа расплачваўся У. Лісоўскі («Расплата»), збіраў словы А. Ваўчонак, дакладваў і праводзіў анкету П. Лагі («Даклад», анкета студэнта-выпускніка), мастак-афарміцель — Л. Закурдаева, аб асабістым думаў дзяжурны ліфцёр — С. Лыскавец («Думкі»).**




**ЛІФТ — гэта Лірычна-Іранічны ФакультэТ, які ўтварыўся пры дапамозе і прамым уплыве нікім не запланаванага і не ўлічанага колькаснага і якаснага жартаўнічага расшырэння кафедры гумарыстычнага і сатырычнага аналізу. ЛІФТ сардэчна віншуе сам сябе з днём нараджэння і жадае працаваць у Новым, 1981 годзе, з сапраўдным студэнцкім запалам!**

● **СВЯТОЧНАЕ МІНІ-АПАВЯДАННЕ**

# РАСПЛАТА



Пад збеленай снегам елкай, паплёўваючы на рукі, стаяў студэнт Рома Клайнаў і прыкідваў, ці ўвойдзе яна ў блочныя габарыты інтэрната.

«Увойдзе!» — цвёрда рашыў Клайнаў і секанўў елку. Яна схамянулася, зарыпела і жалобна нахілілася, як Пізанская вежа.

— Кі-йя! — дзеўбанўў Рома яшчэ раз, і елка лягла, асыпаўшы навакольнае асяроддзе і Клайнава шышкамі. «Пяць балаў!» — ацаніў ён работу і, закрыўшы вочы, уявіў, як будзе вадзіць карагоды вакол прыгажуні пад музыку «дыска».

Цямнела. Рома пашырыў крокі. Хутка ён пачуў стому ў целе і прыхіліўся да задубелай наскрозь асіны. Закурыў.

«Вунь колькі тут гэтага дабра, гаць гаці, — падумаў услых Клайнаў.—А на рынку па рублю метр. Гадзіну ў чарзе трасіся. Дастаяўся — разабралі. А тут бяры — не хачу».

Рома пацягнуў каштоўны груз далей. Хутка ён ужо борзда траляваў елку па абмерзлай Ракаўскай шашы. Пачуўся гул матора.

— Куды? — груба пацікавіўся нехта у кепцы.

— Да бабкі на хутар! — рашуча зманіў Рома. Шкло закрылася, і машына загрукатала, пакрыўшы Клайнава адкідамі няпоўнага згарання.

Сцямнела канчаткова. Крок за крокам, няспешна, але ўпэўнена набліжаўся Рома Клайнаў да мэты. Нябачна для сябе і нечакана для астатніх паявіўся ён пад касяком родных дзвярэй. З розных бакоў да яго кінуліся аднакурснікі, таварышы, сябры і іншыя неафіцыйныя асобы. З рук у рукі перадавалі доўгачаканы зялёны цуд. Рому цалавалі, падкідвалі, моцна ціснулі аслабелыя рукі і проста віншавалі. Пасля бурнай сустрэчы Клайнава занеслі ў ванну з гарачай вадой. Адтайваць.

У 23.50 стол быў накрыты, а ў куце стаяла духмяная навагодняя прыгажуня. Усе былі вясёлыя, у свежых кашулях і без галаўных убораў.

— Таварышы! — святочна прамовіў Рома...

Раптам у дзверы рашуча пастукалі.

— Дзед Мароз, Дзед Мароз! — запляскалі ў далоні прысутныя, і на парозе паявіўся чалавек з чырвоным носам і ў валенках.

— Іван Фёдаравіч Макравус — участковы ляснічы, — ветліва прадставіўся ён і працягнуў квітанцыю на штраф. Яна пайшла па руках і нарэшце дасягнула Клайнава. Ён папярхнуўся, згорбіўся і пачырванеў да самых вушэй.

«Гэта расплата», — падумаў ён.

Новы год уступіў у свае правы.

## НАВАГОДНІ КАНЦЭРТ





# ДУМКІ

**(ЗІМНЯЯ НАВЭЛА)**

Тры тысячы семсот трыццаць пяць.

Тры тысячы семсот трыццаць шэсць.

Тры тысячы семсот трыццаць сем...

Учора Рымбікаву з дому пасылку прыслалі: сала, варэнне, яблыкі. Трэба ў госці сёння зайсці. Быццам за канспектам...

Тры тысячы семсот трыццаць восем...

А Ніначка з другой групы нічога. Вочы задуменныя, позірк нейкі загадкавы. У кіно абавязкова запрашу...

Тры тысячы семсот трыццаць дзевяць.

Тры тысячы семсот сорак...

Так, пакуль не забыўся! Трэба ж Фазаву рубель вярнуць. Як-ніяк месяц прайшоў. Абавязкова!..

Празвінеў званок, і трэцякурснік Фёдар Забрындзін стомлена выйшаў з аўдыторыі, так і не ўбачыўшы, як тры тысячы семсот сорак першая сняжынка праляцела за акном...




**Бульдозер** — мензурка

**Лобби** — отеческий поцелуй

**Программирование** — взвешивание

**Роженица** — зеркало

**Бармалей** — дизайнер-оформитель

**Паспорт**—порт, который не принимает

**Пудель** — спортсмен-гиревик

# ДАКЛАД



У сем гадзін дваццаць тры мінуты ў актавай зале інстытута пачалася навуковая канферэнцыя. Першым на кафедру падняўся студэнт Фёдар Бязглуздаў.

— Таварышы, — пачаў ён і наліў вады ў стакан, — я буду вельмі лаканічным, бо тэма, якая прысвечана праблеме комплекснага аналізу мастацкага твора, мае для літаратуразнаўчай навукі вялікае значэнне і таму не дапускае ніякай блытаніны ў яе раскрыцці. Я хачу толькі павярхоўна, не кранаючыся глыбінь, раскрыць перад вамі здзіўляючае эстэтычнае багацце твора Нікадзіма Пікіна «Карчы», якое іскрыцца і пульсуе ў кожным радку хваляваннем і магутнай напружанасцю.

Усе прыціхлі.

Фёдар Бязглуздаў адным залпам выпіў увесь стакан і наліў яшчэ.

— Я зрабіў адкрыццё! Так! Раман Нікадзіма Пікіна вельмі складаны, шматгранны, паліфанічны. У творы ёсць эпілог, незвычайны сюжэт, арыгінальная кампазіцыя, прысутнічаюць вобразы як галоўныя, так і другарадныя, маецца пейзаж, лірычныя і публіцыстычныя адступленні, унутраныя маналогі, дыялогі і іншае. Але галоўнае ў рамане — гэта мова. У рамане 37 частак, 3803 сказы, з іх простых — 792, складаназлучаных — 986, складаназалежных — 2632. Назоўнікаў — 14134, прыметнікаў — 13001, дзеясловаў — 13587, лічэбнікаў роўна тысяча, займеннікаў — 1999, прыслоўяў — 605, дзеепрыметнікаў — 704, дзеепрыслоўяў — 1305...

Слухачы прыкметна спахмурнелі і пачалі пазяхаць.

— А зараз паглядзіце, што робіцца з членамі сказа, — раз'юшана грымнуў Бязглуздаў. — Выказнікаў у рамане 12713, дзейнікаў — 12013, дапаўненняў — 6835, азначэнняў — 7319, акаліч... — ён папярхнуўся, закашляўся, узяў стакан і ў момант асушыў яго.

— Вельмі душна! — закруціў галавою прафесар, які сядзеў у першым радзе і расчыніў акно. У залу ўварвалася марознае снежаньскае паветра. Аўдыторыя ажыла. Перасталі пазяхаць нават тыя, хто не паважаў статыстыку.

Аратар працягваў:

— Эпітэтаў у рамане 199999, метафар — 1503, алегорый роўна 400, інверсій — 111, сінонімаў — 696, амонімаў — 539, антонімаў — 820, прыказак — 51, прымавак — 113...

Марознае паветра п'яніла, голас Бязглуздава гайдаў, бы на хвалях... Не драмалі толькі загартаваныя, трэніраваныя. Прафесар Акулаў пазяхаў, глядзеў у акно, дзе па даху трохпавярховага дома ў двары інстытута, асцярожна, крок за крокам, падкрадвалася да вялікага і смачнага голуба кошка.

— Глядзі, глядзі, Кірыл Пятровіч, — тыцнуў у бок Акулаў заснуўшага суседа. — Зараз цапне, бачыш?

Сусед прачнуўся, заміргаў вачыма.

Кошка нечакана скокнула і злавіла голуба.

Але Бязглуздаў загрымеў яшчэ больш:

— У рамане 473 звароты, 15 унутраных маналогаў, 320 дыялогаў, 407 выпадкаў прамой мовы і 704 — ускоснай...

— Малайчына якая, а? — не вытрымаў Акулаў і ляпнуў суседа па плячах. — Які спрыт...

Зала забылася аб дакладчыку. Яна глядзела на дах.

— Пераходжу да вывадаў, — гучаў здалёк голас Бязглуздава. — Аўтар глыбока ведае сучаснае жыццё. Староні, прысвечаныя апісанню баталій і паядынкаў, проста выдатныя. Колькі ў іх пытальнікаў і клічнікаў!

...Кошка абгрызала апошнюю костачку сваёй ахвяры.

— Дзякуй за ўвагу! — закончыў Бязглуздаў.

— Малайчына! — абрадаваўся прафесар Акулаў.

— Цудоўна, цудоўна! — пранеслася з усіх бакоў.

Фёдар Бязглуздаў знямеў. Потым, дапіўшы шосты стакан, выцер пот і пачаў кланяцца:

— Дзякую, дзякую, таварышы!

Канферэнцыя працягвалася...

**У гэтыя святочныя дні ЛІФТ катэгарычна заяўляе:**




**БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ**

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

25 снежня 1980 г.

АТ 19593 Заказ 1898.

220080 МІНСК-80. УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14.

ТЭЛЕФОН 22-07-19.

Рэдактар В. П. ВАРАБ'ЁЎ